## Класныя навіны

# У ШКОЛУ — З УСМЕШКАЙ!

**Акцыю пад такой назвай праводзяць з 1 жніўня па 30 верасня Мінскі гарадскі цэнтр сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей.**

Яго спецыялісты акажуць бясплатную псіхалагічную дапамогу першакласнікам і іх бацькам па падрыхтоўцы і адаптацыі да новага навучальнага асяроддзя. На індывідуальных кансультацыях вопытныя псіхолагі раскажуць, як справіцца са страхамі, звязанымі з паступленнем дзіцяці ў школу. Бацькі змогуць даведацца, як правільна паводзіць сябе, каб сын ці дачка хутка і лёгка ўліліся ў новы калектыў.

Дзеці паўдзельнічаюць у трэнінгу «Хачу ў школу!», які дапаможа ім зняць душэўнае і эмацыянальнае напружанне, якое ўзнікае пры адаптацыі да новых умоў. На семінарах-практыкумах для бацькоў «Гутаркі на школьным парозе» спецыялісты будуць расказваць пра псіхалагічныя асаблівасці 6—7-гадовага дзіцяці, пра тое, што такое школьная сталасць, як праяўляецца школьная дэзадаптацыя, з якімі цяжкасцямі сутыкаюцца бацькі і настаўнікі ў першыя гады навучання дзяцей, як развіваць і падтрымліваць у дзіцяці жаданне вучыцца.

Нязмушаная творчая абстаноўка заняткаў з псіхолагам дазволіць сфарміраваць у першакласніка станоўчае стаўленне да школы, настаўнікаў і аднагодкаў, а выкананне гульнявых і арт-тэрапеўтычных практыкаванняў дапаможа стаць больш упэўненым і разняволеным.

Усе семінары, трэнінгі і кансультацыі — бясплатныя. Атрымаць больш падрабязную інфармацыю можна па тэлефоне (017) 317-32-32 ■

## Прыёмная кампанія — 2017

# «Камп'ютарная бяспека» падрасла на 85 пунктаў

### У БДУ падвялі вынікі залічэння на дзённую платную форму навучання

**Сярэдні конкурс па ўніверсітэце склаў 1,5 чалавека на месца (у 2016 годзе быў 1,3). Усяго на першы курс залічаны 1912 абітурыентаў. Сярод іх 187 чалавек скончылі з адзнакай сярэднюю школу або сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы (у 2016 годзе — 151). Больш як 300 балаў маюць 28% ад агульнай колькасці абітурыентаў, якія паступалі па выніках трох сертыфікатаў ЦТ (у 2016 годзе — 27%).**

Як і прагназаваў адказны сакратар прыёмнай камісіі БДУ Вячаслаў Малафееў, прахадныя балы выраслі не толькі на бюджэтнай, але і на платнай форме навучання. Прычым на прыродазнаўчых спецыяльнасцях рост адбыўся даволі істотны.

Самыя высокія прахадныя балы на прыродазнаўчым профілі былі зафіксаваныя на спецыяльнасцях «інфарматыка» — 300 (у 2016 годзе — 237); «прыкладная інфарматыка» — 293 (у 2016 годзе — 254); «прыкладная матэматыка» — 291 (у 2016 годзе — 237); «хімія лекавых злучэнняў» — 288 (у 2016 годзе — 262); «актуарная матэматыка» — 282 (у 2016 годзе — 209); «фундаментальная хімія» — 278 (у 2016 годзе — 283); «камп'ютарная матэматыка і сістэмны аналіз» — 277 (у 2016 годзе — 198); «камп'ютарная бяспека» — 267 (у 2016 годзе — 182); «аэракасмічныя радыёэлектронныя і інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі» — 258 (у 2016 годзе — 178); «матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі» — 254 (у 2016 годзе — 195); «эканамічная кібернетыка» — 252 (у 2016 годзе — 218).

На сацыяльна-эканамічным і гуманітарным профілях лідзіруюць: «інфармацыя і камунікацыя» — 336 (было 316); «міжнароднае права» — 326 (было 322); «лінгвакраіназнаўства» — 309 (было — 315); «правазнаўства» — 290 (было 307); «міжнародныя адносіны» — 281 (было — 317); «бізнес-адміністраванне» — 274 (было 243); «сацыяльныя камунікацыі» — 272 (было 220); «кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі» — 267 (было 261); «мытная справа» — 265 (было 245); «сусветная эканоміка» — 264 (было 255); «менеджмент» (кірунак — менеджмент у сферы міжнароднага турызму) — 262 (у 2016 годзе — 249).

Як бачна, парог для паступлення на некаторыя звышпрэстыжныя ў моладзі спецыяльнасці факультэта міжнародных адносін на платнай форме навучання нават знізіўся ў параўнанні з папярэднім годам. У той час як на бюджэтнай форме навучання там быў устаноўлены сёлета абсалютны рэкорд: нагадаем, што для паступлення на спецыяльнасці «міжнароднае права» і «міжнародныя адносіны» трэба было набраць 384 балы з 400 магчымых. А на платнай форме навучання парог на «міжнародных адносінах» аказаўся на 100 пунктаў ніжэйшы ■

## Факт

# РУХ НАПЕРАД

### БДУ працягвае паляпшаць свае пазіцыі ў сусветных рэйтынгах універсітэтаў

У новай рэдакцыі сусветнага рэйтынга Webometrics Ranking of World Universities (WRWU) Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт заняў 506 месца, падняўшыся на 131 пазіцыю ў параўнанні з апошнімі паказчыкамі. У рэйтынгу Webometrics улічваюцца даныя больш як 26 тысяч вышэйшых навучальных устаноў (а ўсяго ў свеце налічваецца больш за 30 тысяч ВНУ). Традыцыйна рэйтынг узначальваюць Гарвардскі, Стэнфардскі ўніверсітэты і Масачусецкі тэхналагічны інстытут.

Белдзяржуніверсітэт стабільна ўваходзіць у тройку лепшых універсітэтаў СНД, наперадзе яго толькі Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М.В. Ламаносава, які займае 215 месца, і Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт (480 месца). Сярод найлепшых універсітэтаў краін-суседзяў у рэйтынгу прадстаўлены Варшаўскі ўніверсітэт (402 месца), Тартускі ўніверсітэт (442), Вільнюскі ўніверсітэт (768), Латвійскі ўніверсітэт (1224), Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт імя Тараса Шаўчэнкі (1296).

Сярод беларускіх вышэйшых навучальных устаноў БДУ нязменна захоўвае першынство. Другое месца займае Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт — у яго 3060 пазіцыя. На трэцім месцы — Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (3084), на чацвёртым — Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы, які размясціўся на 3317 пазіцыі. І замыкае пяцёрку Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі (3569 месца).

Трэба адзначыць, што на працягу апошніх гадоў БДУ дэманструе ўстойлівасць сваіх пазіцый у рэйтынгу WRWU, уваходзячы ў 2% найлепшых універсітэтаў свету. Нагадаем, што сёлета БДУ паказаў высокія вынікі ў трох найбуйнейшых сусветных рэйтынгах. У чэрвені 2017 года ён заняў 334 месца ў брытанскім рэйтынгу Quacquarelli Symonds, быў прадстаўлены ў Times Higher Education і ўпершыню ўвайшоў у Шанхайскі рэйтынг па фізіцы.

Рэйтынг Webometrics Ranking of World Universities вось ужо больш за 10 гадоў складаецца іспанскай даследчай лабараторыяй «Laboratorio de Internet» і абнаўляецца два разы на год: у студзені і ліпені. Вышэйшыя навучальныя ўстановы ранжыруюцца па чатырох паказчыках, якія характарызуюць узровень навуковых публікацый і прысутнасць універсітэтаў у сусветнай інтэрнэт-прасторы: «уплыў» — цытаванасць сайта, «прысутнасць» — памер сайта, «адкрытасць» — колькасць файлаў па інфармацыі пошукавай сістэмы Google Scholar і «якасць» — колькасць публікацый супрацоўнікаў універсітэта, якія трапілі ў 10% найбольш цытуемых у свеце па звестках навукаметрычнай базы даных Scopus ■

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «КОБРИНСКИЙ ССК»**

| Наименование объекта | Начальная цена продажи, руб. без НДС | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| Капитальное строение (инв. №123/С-17913) – здание автогаража, общ. пл. 391,5 кв. м, расположенное на земельном участке пл. 0,0864 га с кадастровым номером 124350100002004500 по адресу: Брестская обл., г. Кобрин, ул. Никольская, 64Е | **13 400,00** | **1 340,00** |

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Условия оплаты** | оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Условия продажи** | без условий |
| **Номер р/сч для перечисления задатка** | р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» РД №100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, г. Брест, ул. Мицкевича,10 УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 28 августа 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10–325 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**Перечень документов, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать по телефонам: (0162) 20-92-13; 21-88-81**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 325 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 27 августа 2017 г. до 17.00**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «КОБРИНСКИЙ ССК»**

| Наименование объекта | Начальная цена продажи, руб. без НДС | Размер задатка, руб |
|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** Капитальное строение (инв. №123/С-17908) – здание цеха деревообработки, общ. пл. 374,4 кв. м, расположенное на земельном участке пл. 0,1676 га с кадастровым номером 124350100001006795 по адресу: Брестская обл., г. Кобрин, ул. Никольская, 64К | **31 685,00** | **3 168,50** |

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Условия оплаты** | оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Условия продажи** | без условий |
| **Номер р/сч для перечисления задатка** | р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, г. Брест, ул. Мицкевича,10 УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 12 сентября 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10–325 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**Перечень документов для участия в аукционных торгах и иную информацию можно узнать по телефонам: (0162) 20-92-13; 21-88-81**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00 Последний день приема заявлений – 11 сентября 2017 г. до 17.00**

**РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 21 августа 2017 г. в 10.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 20% после первых несостоявшихся торгов по продаже объектов недвижимости – зданий производственной базы, расположенных по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Буденного, 1, принадлежащих Открытому акционерному обществу «Хойникский Агросервис» на праве собственности**

| № лота | Наименование и адрес объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, рублей (в т.ч. НДС по ставке 20%) | Задаток, рублей (в т.ч. НДС по ставке 20%) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Административное здание, **инв. №343/С-76864.** Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Буденного, 1 | Назначение: здание административно-хозяйственное. Одноэтажное кирпичное строение, 1989 года постройки. Общая площадь 85,0 кв. м. *Составные части и принадлежности: навес* | **106 094,24** | **1 061,00** |
| | Здание проходной, **инв. №343/С-76884.** Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул.Буденного, 1/1 | Назначение: здание специализированное иного назначения. Одноэтажное кирпичное строение, 1989 года постройки. Общая площадь 5,9 кв. м | | |
| | Здание «Ленкомната», **инв. №343/С-76885.** Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Буденного, 1/2 | Назначение: здание специализированное иного назначения. Одноэтажное кирпичное строение, 1990 года постройки. Общая площадь 90,9 кв. м | | |
| | Здание гаража, **инв. №343/С-77004.** Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Буденного, 1/3 | Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта. Одноэтажное металлическое строение, 1987 года постройки. Общая площадь 203,2 кв. м | | |
| | Здание гаража, **инв. №343/С-76886.** Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Буденного, 1/4 | Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта. Одноэтажное кирпичное строение, 1987 года постройки. Общая площадь 411,7 кв. м. *Составные части и принадлежности: две пристройки.* | | |
| | Здание, **инв. №343/С-76887.** Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Буденного, 1/5 | Назначение: здание специализированное иного назначения. Одноэтажное кирпичное строение, 1987 года постройки. Общая площадь 304,3 кв. м | | |

***Земельный участок** для обслуживания зданий на праве постоянного пользования площадью **0,8391 га** с кадастровым номером 325450100001017024. **Имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные: на территориях, подвергшихся радиоактивному загрязнению, площадь 0,8391 га; в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0533 га.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством*

Шаг аукциона – 5%. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 18 августа 2017 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09-00 до 10-00 **21 августа 2017 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объекты по начальной цене, увеличенной на 5%.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно предоставляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY84ALFA30122305700080270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 8 августа 2017 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшими победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объектов. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан:** в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 2% от окончательной цены продажи Объектов; в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объектов; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объектов, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за Объекты, такая оплата должна быть произведена в течение 60 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи Объектов.

*Извещение о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту было опубликовано в газете «Звязда» от 28.06.2017 г. №121.*

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23.**
**☎ 8 (0232) 32-46-47; 32-00-71; 32-18-95 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by**
**Продавец: ОАО «Хойникский Агросервис», 247622, Гомельская обл., г. Хойники, ул. Кирова, 27. ☎ 8 (02346) 4-55-04; 8 (044) 515-45-22 •**